# РАЗДЗЕЛ 1
# КРЫНІЦЫ ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ І СУСЕДНІХ ЗЕМЛЯЎ XI–XVIII стст.

**Макараў М.Дз.**

## ВІЦЕБСКАЕ МЕСЦКАЕ ПРАВА: ДА 450-ГОДДЗЯ З'ЯВЫ

6 чэрвеня 2011 г. споўнілася 450 гадоў з таго моманту, калі Віцебск атрымаў ад вялікага князя літоўскага Жыгімонта Аўгуста свой першы месцкі прывілей. Гэта падзея мела выключнае значэнне для гісторыі Віцебска і іншых месцкіх паселішчаў Беларускага Падзвіння. Прывілей, нададзены віцебскім мяшчанам 6 чэрвеня 1561 г., легітымізаваў арыгінальную сістэму месцкага права, што склалася на аснове мясцовага земскага права. Пасля афармлення ў Віцебску гэта сістэма шырока распаўсюдзілася на землях рэгіёна: Правы на ўзор Віцебска ў гатовым выглядзе атрымалі Сураж (1570 г.), Ула (1577 г.) і Веліж (1582 г.). На землях Падзвіння віцебскае месцкае права працяглы час паспяхова канкурыравала з агульнапрынятай у Вялікім княстве Літоўскім (далей – ВКЛ) магдэбургскай мадэллю. Паспрабуем сцісла акрэсліць гісторыю гэтай унікальнай з'явы.

Да надання Віцебску ў 1561 г. асобнага месцкага прывілея мяшчане карысталася адзіным для ўсіх катэгорый свабоднага насельніцтва рэгіёна віцебскім земскім правам, асноўныя нормы якога фіксаваліся Віцебскім земскім прывілеем. Гэты дакумент адрасаваўся «всим княземъ, боярамъ и слугам витебским, войту и мещаномъ места тамошнего, и всей земле Витебской». У сярэдзіне XV – першай палове XVI ст. у рамках віцебскага земскага права быў выпрацаваны шэраг нормаў, якія рэгулявалі выключна прававое становішча мяшчанства. Толькі некаторыя з іх былі ўключаны ў склад Віцебскага земскага прывілея, а асноўная частка працягвала дзейнічаць у рамках няпісанага права. У першай палове XVI ст. мяшчанская абшчына Віцебска ўжо карысталася пэўнай аўтаноміяй і мела арыгінальныя органы самакіравання, якія складаліся з войта і «старшых мяшчан».

Князі і баяры, з аднаго боку, войт і мяшчане – з другога доўгі час супольна карысталіся агульным Віцебскім земскім прывілеем, але каля 1540 года паміж гэтымі сацыяльнымі групамі ўзнік востры канфлікт. Галоўнай прычынай сутыкненняў паслужыла тое, што прывілей захоўваўся менавіта ў войта і мяшчан, якія «княземъ и боярам ховати его не давали». Пакрыўджаныя князі і баяры Віцебскай зямлі ездзілі шукаць справядлівасці ў Вільню, дзе скардзіліся на дзеянні войта і мяшчан панам-радзе ВКЛ. Улады выклікалі прадстаўнікоў абодвух бакоў у сталіцу дзяржавы, дзе ў прысутнасці радных паноў яны даказвалі свае правы захоўваць прывілей. Выслухаўшы аргументы бакоў, улады прынялі наступнае рашэнне: загадалі трымаць агульны для ўсіх Віцебскі земскі прывілей у спецыяльна прызначанай для гэтага скрыні, адзін ключ ад якой мусілі захоўваць князі і баяры, а другі – войт і мяшчане. Арыгінал прывілея можна было браць як адным, так і другім толькі ў найбольш адказныя і ўрачыстыя моманты. Для вырашэння паўсядзённых пытанняў былі зроблены дзве копіі прывілея, замацаваныя дзяржаўнай пячаткай. Адна копія прызначалася князям і баярам, другая – войту і мяшчанам. Копіі прывілея самі па сабе не мелі юрыдычнай сілы. Аднак перададзеная віцебскім мяшчанам 9 ліпеня 1541 г. копія Віцебскага земскага прывілея адыграла прыкметную ролю ў станаўленні віцебскага месцкага права. Яна адрасавалася менавіта мяшчанам: «А такъ маютъ воит и мещане места […] Витебского тот лист нашъ у себе держати и тым листом въ потребах своихъ оборону чинити и во всем том заховатися» [1; 83 – 84].

У хуткім часе віцебскія князі і баяры выпрасілі ў новага караля польскага і вялікага князя літоўскага Жыгімонта Аўгуста пацвярджэнне іх копіі віцебскага земскага прывілея, якая ў выніку набыла сілу юрыдычнага дакумента і стала першым выклю-



Рэпазіторый ВДУ

чна княска-баярскім прывілеем Віцебскай зямлі. Пасля гэтага, ў сваіх дзеяннях, скіраваных супраць войта і мяшчан, князі і баяры пачалі абапірацца на юрыдычную моц двух дакументаў. Апошні прывілей, які практычна слова ў слова паўтараў стары земскі, дадаў князям і баярам упэўненасці, што яны карыстаюцца больш шырокім наборам правоў, чым мяшчане.

У адказ на дзеянні князёў і баяраў, якія выкарысталі сваё «больш упрывілеяванае» становішча і пачалі асаджваць сваіх падданых на месцкіх землях, войт і мяшчане звярнуліся да вялікага князя са скаргамі. Жыгімонт Аўгуст разгледзеў іх і пацвердзіў перададзеную мяшчанам у 1541 г. копію старажытнага земскага прывілея, чым надаў ёй сілу юрыдычнага дакумента. Такім чынам, 6 чэрвеня 1561 г. віцебскія мяшчане атрымалі свой першы выключна месцкі прывілей, які фармальна «ўраўнаваў» іх у правах з князямі і баярамі Віцебскай зямлі.

У выніку з аднаго старога Віцебскага земскага прывілея атрымаліся два: першы – для князёў і баяраў, другі – для мяшчан. Гэтыя прывілеі нічым не адрозніваліся адзін ад аднаго. Іх тэксты былі практычна ідэнтычныя. Але ў прававой свядомасці грамадства Віцебскай зямлі адбыліся значныя змены. Раней яно карысталася адзіным прывілеем, які кансалідаваў усе сацыяльныя групы і з'яўляўся гарантыяй рэгіянальнай аўтаноміі. Цяпер князі з баярамі і мяшчане карысталіся гэтым дакументам асобна. Той жа набор палажэнняў для першых стаў увасабленнем права земскага (шляхецкага), а для другіх – права месцкага [1; 84 – 85].

Тэкст віцебскага месцкага прывілея 1561 г. не адпавядаў рэаліям віцебскага месцкага права. У яго склад не былі ўключаны многія нормы, якія рэгулявалі прававое становішча мяшчан Віцебска ў сярэдзіне XVI ст. У другой палове XVI ст. ён утрымліваў усё той жа набор палажэнняў, што трапілі ў склад Віцебскага земскага прывілея (які набыў свой канчатковы выгляд у 1440 – 1447 гг.) яшчэ ў XIV – першай палове XV ст. Пры чарговых пацвярджэннях месцкага прывілея ў 1582 г. Стафанам Баторыем і ў 1592 г. Жыгімонтам Вазам яго, згодна са звычаем, перапісвалі ў нязменным выглядзе. Усе сацыяльныя групы віцебскага грамадства, у першую чаргу баяры і мяшчане, лічылі тэкст старога Віцебскага земскага прывілея натуральным пачаткам усіх правоў, якімі яны карысталіся. Да гэтага дакумента ставіліся з выключнай павагай і нічога ў ім не мянялі.

Адлюстраванне рэальных нормаў і практыкі віцебскага месцкага права другой паловы XVI ст. можна прасачыць па тэкстах прывілеяў Суража 1570 г. і Улы 1577 г. Яны былі нададзены на ўзор Віцебска і ўтрымлівалі асноўныя нормы віцебскага месцкага права [2; с. 198 – 199]. Гэтыя прывілеі гарантавалі мяшчанам Суража і Улы цалкам ідэнтычны набор правоў. Мяшчане заставаліся пад юрысдыкцыяй мясцовага гаспадарскага ўрадніка, які мог судзіць іх толькі ў прысутнасці войта і «старшых» мяшчан. Пры гэтым, некаторыя катэгорыі спраў ніжэйшага ўзроўню знаходзіліся непасрэдна ў судовай кампетэнцыі органаў самакіравання мяшчанскай абшчыны. Мяшчане атрымалі права на выбар войта, бязмытны гандль на тэрыторыі ВКЛ (не датычыла ўвозу солі з Рыгі і вывазу воску да Рыгі і Вільні), правядзенне двух кірмашоў у год, вольнае распараджэнне сваей рухомай і нерухомай маемасцю (у тым ліку, права свабодна завяшчаць яе ў спадчыну як сваяку, так і любому іншаму чалавеку), свабоду выбару месца жыхарства на тэрыторыі ВКЛ. Ім былі перададзены землі на адлегласці 1 мілі вакол замка [1; с. 85 – 90].

Тэксты месцкіх прывілеяў Віцебска, Суража і Улы сведчаць пра тое, што галоўнай павіннасцю мяшчан на віцебскім праве ў другой палове XVI ст. было «службу конную военную напротивко неприятелю нашому заступовати». Размова ў дадзеным выпадку ідзе не пра тых мяшчан, якія валодалі маёнткамі на земскім праве і выконвалі вайсковую павіннасць разам са шляхтаю. У Віцебскай зямлі гэтая група выразна адрознівалася ад звычайных мяшчан, і з 70-х гг. XVI ст. вызначалася тэрмінам «мяшчане конныя». У другой палове XVI ст. у местах на віцебскім праве вайсковая конная служба была абавязкам усяго «посполитого» мяшчанства.

Рэпазіторый ВДУ

У сваім прывілеі 6 чэрвеня 1561 г. віцебскім мяшчанам Жыгімонт Аўгуст гарантаваў ім тыя ж правы і вольнасці, «яко и князи и бояре тамошние за листом на них особы от нас даным […] уживають». Віцебскае месцкае права выводзілася з земскага права Віцебшчыны і па сваёй сутнасці мала ад яго адрознівалася. Мяшчане выконвалі вайсковую конную службу і карысталіся рыцарскім правам [1; с. 93].

Ва ўмовах несупынных канфліктаў ВКЛ з Маскоўскай дзяржавай на неспакойным памежжы такая сістэма саслоўных правоў мяшчанства была нават больш прыдатнай, чым магдэбургская. У 70 – 80-я гг. XVI ст. правы на ўзор Віцебска атрымалі тры іншыя паселішчы рэгіёну. 5 чэрвеня 1570 г. віцебскае месцкае права было нададзена Суражу, а 26 студзеня 1577 г. – Уле. Згадку аб наданні віцебскага права Веліжу ўтрымлівае ліст Стафана Баторыя да віцебскага ваяводы Станіслава Паца ад 7 снежня 1582 г. [1; 98 – 99].

У 90-я гг. XVI ст. адбыўся працяглы канфлікт паміж коннымі і паспалітымі мяшчанамі Віцебска, у выніку чаго сістэма самакіравання, што існавала тут раней, практычна перастала функцыянаваць. Каб пераадолець крызіс улады ВКЛ пайшлі на радыкальную змену прававога становішча мяшчанскай абшчыны. 17 сакавіка 1597 г. Віцебск атрымаў ад вялікага князя літоўскага Жыгімонта Вазы прывілей на магдэбургскае права. Аднак гісторыя віцебскага месцкага права на гэтым не скончылася.

Магдэбургскае права дзейнічала ў Віцебску да 1624 г. Пасля забойства 12 лістапада 1623 г. віцебскімі мяшчанамі полацкага уніяцкага архіепіскапа Іасафата Кунцэвіча, паводле распараджэння Жыгімонта Вазы ад 9 снежня 1623 г. і дэкрэта камісарскага суда ад 22 студзеня 1624 г., места было пазбаўлена ўсіх правоў, якімі да гэтага карысталася, а яго насельніцтва пераведзена непасрэдна пад юрысдыкцыю віцебскага ваяводы. Адносіны ўлад ВКЛ да апальных віцяблян палепшыліся толькі ў гады Смаленскай вайны (1632 — 1634 гг.). 7 кастрычніка 1633 г. Уладзіслаў Ваза, прымаючы пад увагу заслугі віцяблян пад час баявых дзеянняў, вярнуў Віцебску ўсе правы, якімі места карысталася да надання магдэбургскага права. Фактычна мяшчанам ізноў было дазволена карыстацца віцебскім месцкім правам. Ва ўмовах Смаленскай вайны, што яшчэ працягвалася, такое рашэнне мела практычны сэнс, бо галоўнай павіннасцю мяшчанства ў рамках гэтай прававой сістэмы традыцыйна было нясенне коннай вайсковай службы. Віцебскае месцкае права дзейнічала ў Віцебску да 28 верасня 1641 г., калі Уладзіслаў Ваза надаў месту другі прывілей на магдэбургскае права. У Суражы і Веліжы яно функцыянавала па меншай меры да пачатку вайны 1654 – 1667 гг., калі гэтыя месты на працяглы час трапілі пад уладу Маскоўскай дзяржавы [1; с. 110, 116 – 117].

Пэўнай аналогіяй тым працэсам, якія адбываліся ў сацыяльна-палітычным жыцці местаў Віцебшчыны ў другой палове XVI ст. можа служыць хіба што першая спроба надання месцкіх правоў польскаму Плоцку. У 1237 г. усім жыхарам гэтага места, што стала пражывалі ў Плоцку ці маглі пасяліцца тут у будучым, былі нададзены такія ж правы, якімі карысталася рыцарства Мазавецкай зямлі [3; с. 200, 202.]. Аднак, пра рэалізацыю пастановаў гэтага прывілея на практыцы нічога невядома.

Працэс афармлення ўпрывеліяванага шляхецкага саслоўя суправаджаўся стратай астатнімі катэгорыямі свабоднага насельніцтва сваіх правоў. Ён ставіў мяшчан, якія раней карысталіся тым жа правам, што і рыцарства (баярства), у вельмі неспрыяльную прававую сітуацыю. Каб выправіць яе ўлады дзяржавы маглі пайсці па двух шляхах: 1) перавесці мяшчанства на імпартаванае з Заходняй Еўропы нямецкае права; 2) пацвердзіць старажытныя правы мяшчанства ў якасці яго саслоўных прывілеяў, інакш кажучы, фактычна зраўнаць мяшчанства ў правах з рыцарствам. Як у Плоцку, так і ў Віцебску мела месца спроба ажыццяўлення другога варыянта. Аднак, як падаецца, ва ўмовах шляхецкага грамадства (для ВКЛ гэта перыяд пасля ўвядзення Статута 1566 г.) такія сістэмы не мелі шансаў існаваць доўга.

Цяжка сказаць, ці асэнсоўвалі віцебскія, суражскія, ульскія і веліжскія мяшчане сваё віцебскае права як асобную сістэму месцкага права. Наўрад ці яны разумелі, што ў

іх жыцці адбываецца нешта ўнікальнае. Для віцяблян гэта права было натуральным працягам тых правоў, якімі яны карысталіся раней. Яго ўвядзенне стала спробай замацаваць за мяшчанамі іх старажытныя правы і абавязкі ва ўмовах саслоўнага грамадства. Тым не менш, застаецца фактам, што віцебскае права аформілася ў самадастатковую сістэму саслоўных правоў мяшчанства і ў якасці гатовай мадэлі было нададзена шэрагу іншых месцкіх паселішчаў. Віцебскае месцкае права – адзіная мадэль месцкага права славянскага паходжання, якая дзейнічала на тэрыторыі Усходняй Еўропы ў XVI – першай палове XVII ст.


1. Макараў М. Дз. Ад пасада да магдэбургіі: праваое становішча насельніцтва местаў Беларускага Падзвіння ў XIV – першай палове XVII ст. Мінск: Экаперспектыва, 2008.
2. Von Werdt, C. Stadt und Gemeindebildung in Ruthenien: okzidentalisierung der Ukraine und Weißrusslands im Spätmittelalter und in der frühen Neuzeit. Wiesbaden: Harrassowitz Verlag, 2006.
3. Wyrozumski J. Dzieje Polski piastowskiej (VIII wiek – 1370). Kraków, 1999.


**Доўнар А.Б.**

## ПРЫВІЛЕІ ВІЦЕБСКА СА ЗБОРУ ПЕРГАМІНАВЫХ АКТАЎ ГАЛОЎНАГА АРХІВА СТАРАЖЫТНЫХ АКТАЎ У ВАРШАВЕ

У часы Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ) гарады клапаціліся аб павышэнні свайго статуса ў дзяржаве і аб павелічэнні сваёй «упрывілеяванасці». Таму кожны горад імкнуўся распаўсюдзіць на сябе як мага большую колькасць правоў і свабод. Не выключэннем быў і Віцебск.

Віцебск меў даўнія традыцыі самакіравання з часоў, калі ён быў цэнтрам Віцебскай зямлі. У XV – першай палове XVI ст. віцебскія мяшчане карысталіся разам з князямі, баярамі-шляхтай і іншымі свабоднымі катэгорыямі насельніцтва Віцебшчыны агульным земскім прывілеям Віцебскай зямлі. З умацаваннем шляхецкай дэмакратыі і кансалідацыяй саслоўяў сітуацыя з юрыдычным афармленнем праў горада змянілася і мяшчане сталі імкнуцца мець свае прывілеі. Чаго і дабіліся ў 1561 г. [4. с. 82-85].

Асноватворнымі для Віцебска былі прывілеі 1561, 1582, 1592, 1597, 1641, 1650, 1669, 1676, 1697, 1735 і 1767 гадоў. Кожны прывілей меў свае адметнасці і свой лёс. Мяшчане Віцебска клапатліва захоўвалі арыгіналы сваіх прывілеяў ў гарадскім архіве на працягу XVI–XVIII ст. Але ў пачатку XIX ст. арыгіналы прывілеяў Віцебска зніклі. Па звесткам А. Сапунова арыгіналы віцебскіх гарадскіх прывілеяў былі пасланы ў 1803 г. віцебскім пракурорам Манькоўскім у Санкт-Пецярбург міністру юстыцыі Расійскай імперыі па справе мяшчан Віцебска, якія прасілі аб захаванні праў і прывілеяў горада. Але гарадскія дакументы па прызначэнню не былі дастаўлены [3. С. XXI]. Далейшы лёс прывілеяў застаўся невядомым. І пытанні: ці былі давезены прывілеі да Санкт-Пецярбурга, ці яны прапалі па дарозе, застаюцца без адказу і цяпер.

Так ці інакш, у цяперашні час пяць прывілеяў Віцебска XVI – XVIII ст. захоўваюцца ў Галоўным архіве старажытных актаў у Варшаве (далей – ГАСА) ў Зборы пергамінавых актаў. Гэта прывілеі Віцебска польскіх каралей і вялікіх князей літоўскіх Жыгімонта III Вазы ад 13 кастрычніка 1592 г. і 17 сакавіка 1597 г., Яна III Сабескага ад 20 сакавіка 1676 г., Аўгуста III ад 27 лістапада 1735 г. і Станіслава Аўгуста ад 01 студзеня 1767 г. (гл. табліцу).

*Табліца: Месца знаходжання арыгіналаў прывілеяў Віцебска*

| Сігнатура | Дата | Арыгінальнасць | Матэрыял дакумента | Памер дакумента |
|---|---|---|---|---|
| ГАСА. Збор пергамінавых актаў. № 9136 | 13.10.1592 | арыгінал | пергамін | 73 ×44+10,5 |
| ГАСА.Збор пергамінавых актаў. № 9137 | 17.03.1597 | арыгінал | пергамін | 66,7×44,5+9 |



Репозиторий ВГУ